# Стан душы

Выканала Валканоўская
Анастасія Раманаўна,
вучаніца 6 “К”класа

Чым больш табе я сэрца адкрываю,
Тым больш з табой зліваюся ў адно…

Дэмбская

Нядаўна я пачула верш Інэсы Дэмбскай “ Адзінства”, які заставіў мяне задумацца і паразважаць над цяжкім і , адначасова, загадкавым пытаннем.

Дык што ж такое адзінства? У тлумачальным слоўніку я знайшла тлумачэнне, што гэта “цэласнасць, непадзельнасць”. За гэтымі “сухімі” словамі, я лічу, хаваецца нешта больш значнае для чалавека і Радзімы.

Я адважуся выказаць здагадку, што адзінства нараджаецца і бярэ пачатак ў сям’і. Мая сям’я невялікая. Яна складаецца з пяці чалавек, Мы розныя па ўзросту, маем свае погляды на жыццё, але ў нас ёсць агульнае, што яднае, робіць сям’ю моцнай – гэта любоў і павага, адчуванне падтрымкі у цяжкія хвіліны ад блізкіх людзей, разуменне праблем адзін аднаго і радасць ад перамог і дасягненняў кожнага. Гэта такі стан душы і жыцця, калі ўсім зручна, цікава, калі пануе ўзаемадапамога і любоў.

Па-другое, калі існуе еднасць людзей, што пражываюць на агульнай тэрыторыі, то гэта дасць магчымасць стаць дзяржаве моцнай і прыгожай. У маім горадзе нарадзіўся “Фестываль нацыянальных культур”. Беларусы, украінцы, літоўцы, палякі, грэкі і людзі іншых нацыянальнасцей збіраюцца разам і знаёмяць нас са сваімі звычаямі і асаблівасцямі культуры. Але ўсіх іх аб’ядноўвае міралюбства, прыязнае стаўленне адзін да аднаго, жаданне жыць ў міры і спакоі. Таму святочны настрой і сяброўскія адносіны, што прысутнічаюць па час фестываля, можна наглядаць у горадзе кожны дзень. Я лічу, што гэта таксама адзінства краіны.

17 верасня ў Беларусі адзначаецца свята Дзень народнага адзінства. Гэта свята чалавечнасці і таварыскасці, добрых адносін, якія аб’ядноўваюць людзей нашай краіны. Свята ўзнікла нядаўна, але становіцца папулярным, таму што прысвечана гістарычным падзеям маёй Беларусі, прысвечана майму памяркоўнаму і працавітаму народу. Гісторыю чалавецтва, краіны нельга перакрэсліць, так і адзінства нельга

знішчыць, калі народ, кожны чалавек  жадае мець шчаслівае будучае і незалежнасць. Таму мы магутныя духоўна, а гэта вялікае шчасце.

Калі б я мела магчымасць унесці Ў слоўнік тлумачэнне “адзінству”, то гучала б яно так: гэта стан душы, калі людзі разумеюць і паважаюць адзін аднаго, калі ты, як частка агульнага вялікага, адчуваеш сябе значным і шчаслівым у сваёй краіне.

Даеш ты мне бясконцага многа:
У духоўнай сувязі з табой
Знаходжу для жыцця зямнога
І сэнс, і радасць, і любоў…